

Я. Варонка.




Білет члена Беларускай Сацыялістычнай Грамады Я. Варонкі. 1917. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.

**ВАРО́НКА** Язэп [Іосіф Якаўлевіч; 4(17).4.1891, Сакольскі пав.— 4.6.1952], беларускі палітычны дзеяч, журналіст, публіцыст. Быў вольнаслухачом юрыд. ф-та Пецярбургскага ун-та, выключаны ў 1914 за неўнясенне платы за навучанне. Супрацоўнічаў у пецярбургскіх газетах «Столичные вести», «Воскресная вечерняя газета», час. «Зритель», пісаў вершаваныя творы (друк. пад псеўд. Юрый Вегаў). Пасля Лют. рэв. 1917 уступіў у *Беларускую сацыялістычную грамаду*, з чэрв. 1917 член яе ЦК. Прадстаўляў бел. арг-цыі ў Асобай нарадзе для выпрацоўкі палажэння аб выбарах ва Усерасійскі Устаноўчы сход, удзельнічаў у рабоце Дзярж. нарады (жн. 1917, Масква). У прамове на Усерасійскай дэмакр. нарадзе (вер. 1917, Петраград) ад імя Цэнтр. рады бел. арг-цый выказаўся супраць урадавай кааліцыі сацыяліст. партый з буржуазнымі. Уваходзіў у склад Часовага савета Расійскай рэспублікі (Перадпарламента). Да снеж. 1917 узначальваў камітэт *Беларускага таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны*. На II сесіі Цэнтр. рады бел. арг-цый (кастр. 1917, Мінск) падтрымаў прапановы аб увядзенні аўтаноміі Беларусі явачным парадкам; выбраны камісарам юстыцыі і ўнутр. спраў Вял. бел. рады. Удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні *Усебеларускага з'езда 1917*. У лютым — ліп. 1918 старшыня *Народнага сакратарыята Беларусі* і народны сакратар замежных спраў, адзін з ініцыятараў абвяшчэння *Беларускай Народнай Рэспублікі* (БНР). У крас. 1918 разам з інш. актывістамі Рады БНР падпісаў тэлеграму кайзеру Вільгельму II з падзякай «за вызваленне Беларусі нямецкімі войскамі ад цяжкага прыгнёту, гвалту і анархіі». Рэдагаваў час. *«Варта»*. З канца 1918 арыентаваўся на Літоўскую тарыбу, разглядаючы яе як натуральнага саюзніка ў барацьбе за бел. дзяржаўнасць; у снеж. 1918 — крас. 1920 міністр беларускіх спраў і чл.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы